**Кантрольныя тэсты па тэме "Даданыя члены сказа"**

**Тэст 1**

***1. Адзначце правільнае сцверджанне:***

1) Акалічнасць – член сказа, які абазначае прадмет думкі.

2) Акалічнасць – член сказа, які абазначае дзеянне або стан прадмета.

3) Акалічнасць – член сказа, які паясняе слова са значэннем прадмета думкі.

4) Акалічнасць – член сказа, які абазначае прымету прадмета.

5) Акалічнасць – член сказа, які абазначае абставіны і характар дзеяння, стану або праяўлення прыметы.

***2. Адзначце правільнае сцверджанне:***

1) Дапаўненне – член сказа, які абазначае абставіны і характар дзеяння.

2) Дапаўненне – член сказа, які абазначае прадмет думкі.

3) Дапаўненне – член сказа, які абазначае прымету, якасць ці ўласцівасць прадмета.

4) Дапаўненне – член сказа, які абазначае аб'ект дзеяння, стану ці прыметы.

5) Дапаўненне – член сказа, які абазначае дзеянне, стан або прымету прадмета.

***3. Адзначце правільнае сцверджанне:***

1) Азначэнне – член сказа, які абазначае дзеянне або стан прадмета.

2) Азначэнне – член сказа, які абазначае якасць, прымету, уласцівасць прадмета.

3) Азначэнне – член сказа, які абазначае прадмет, што залежыць ад дзеяння, прыметы.

4) Азначэнне – член сказа, які абазначае абставіны дзеяння.

5) Азначэнне – член сказа, які абазначае прадмет думкі.

***4. У залежнасці ад спосабу выражэння і сувязі з кіруючым словам дапаўненні падзяляюцца на :***

1) прыдзеяслоўныя;

2) прызлучнікавыя;

3) прамыя;

4) прыадвербіяльныя;

5) ускосныя.

***5. Прамое дапаўненне можа выражацца:***

1) назоўнікам у форме вінавальнага склону;

2) займеннікам у форме вінавальнага склону;

3) дзеепрыметнікам;

4) назоўнікам у форме роднага склону;

5) назоўнікам у форме вінавальнага склону з прыназоўнікам.

***6. Ускоснае дапаўненне можа выражацца:***

1) інфінітывам;

2) назоўнікам у форме вінавальнага склону;

3) назоўнікам у форме меснага склону;

4) займеннікам у форме вінавальнага склону з прыназоўнікам;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

5) дзеепрыслоўем.

***7. Дапасаванае азначэнне можа выражацца:***

1) асабовым займеннікам;

2) прыналежным займеннікам;

3) дзеепрыслоўем;

4) прыслоўем;

5) дзеепрыметнікам.

***8.Недапасаванае азначэнне можа выражацца:***

1) указальным займеннікам;

2) назоўнікам;

3) зваротным займеннікам;

4) інфінітывам;

5) дзеепрыслоўем.

***9. Адзначце сказы з прамымі дапаўненнямі:***

1) Быць можа рынешся далоў, не хопіць сілы ўзняцца зноў (М.Лужанін).

2) Адам Міцкевіч ведаў і глыбока адчуваў стыхію народнай творчасці (Р.Шырма).

3) Чароўнымі, сардэчнымі песнямі спавіта наша звонкагалосая беларуская зямля (Р.Шырма).

4) Птушка рада вясне, а дзіця маці (Прыказка).

5) Хто яго тут пакінуў, гэта рэха жывое? Можа, статак ласіны, ідучы з вадапою? (К.Кірэенка).

***10. Адзначце сказы з недапасаванымі азначэннямі:***

1) Летнія навальніцы з громам, маланкай асабліва зацяжнымі не бываюць (І.Навуменка).

2) Люся ішла па ціхай пустой вуліцы, падобнай на вясковую (Л.Арабей).

3) Сілу песні чалавек адчувае даўно (Р.Шырма).

4) Маці была высокая ростам, і рукі яе заўсёды пахлі мылам (К.Чорны).

5) Дарога праз масток ішла раз’езджаная, бітая і за млынам цяжка рвалася на ўзгорак (К.Чорны).

***11. Адзначце сказы з дапасаванымі азначэннямі:***

1) Дарога перайшла ў алею, абсаджаную высокімі ліпамі (В.Вітка).

2) Язычок у мядзведзіка быў шэры і толькі ледзь-ледзь у ружовае (У.Караткевіч).

3) Ужо мабілізаваны ў армію, ён спадзяваўся, што яго сям’я эвакуіравалася (У.Краўчанка).

4) Людзі хацелі выйсці жывымі і здаровымі з пекла вайны (Э.Самуйлёнак).

5) Сцёпка хадзіў задуменны, устрывожаны (Якуб Колас).

***12. Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы з’яўляюцца прыдаткамі:***

1) **Дзед** Астап вельмі любіў гэты лес, любіў балоты, парослыя дурніцамі (Якуб Колас).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2) Спадарожны **Пятра** быў Захар Палянскі, чалавек сярэдніх гадоў (Якуб Колас).

3) У Тураве жыў князь **Яраслаў**, багаты і мудры (У.Арлоў).

4) Ніколі не заплямілі гонару Айчыны **воіны**-палачане (В.Лукша).

5) Вялікую смеласць праявілі аўтары **паэмы** “Тарас на Парнасе” і “Энеіда навыварат”, узвёўшы на літаратурны парнас беларускага мужыка (А.Адамовіч).

***13. Адзначце сказы з акалічнасцямі мэты:***

1) Спрасонку хлопчык ускрыкнуў і зноў моцна заснуў (А.Якімовіч).

2) Нездарма заветнымі начамі снілася мне блізкая вясна (В.Вітка).

3) Касалапы зручна ўмясціўся ў дупле, мабыць, мяркуючы адпачыць тут да ранку (В.Быкаў).

4) Па законах таго часу мы не мелі права на спадчыну (В.Адамчык).

5) Сыноў бацька сваіх кліча на нараду ў хату (Янка Купала).

## Тэст 2

***1. Член сказа, які абазначае якасць, прымету, уласцівасць прадмета, -- гэта:***

1) дзейнік;

2) выказнік;

3) акалічнасць;

4) азначэнне;

5) дапаўненне.

***2.Член сказа, які абазначае аб’ект дзеяння, стану або прыметы, -- гэта:***

1) дапаўненне;

2) азначэнне;

3) дзейнік;

4) выказнік;

5) акалічнасць.

***3. Член сказа, які абазначае абставіны і характар дзеяння, стану або праяўлення прыметы, -- гэта:***

1) выказнік;

2) азначэнне;

3) акалічнасць;

4) дзейнік;

5) дапаўненне.

***4. У залежнасці ад спосабу выражэння і сувязі з кіруючым словам дапаўненні падзяляюцца на:***

1) прамыя;

2) ускосныя;

3) прыдзеяслоўныя;

4) прыйменныя;

5) прыадвербіяльныя.

***5. Прамое дапаўненне можа выражацца:***

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1) інфінітывам;
2) дзеепрыслоўем;
3) назоўнікам у форме вінавальнага склону;
4) займеннікам у форме меснага склону;
5) прыслоўем.

***6. Ускоснае дапаўненне можа выражацца:***

1) назоўнікам у форме давальнага склону;
2) займеннікам у форме творнага склону;
3) займеннікам у форме вінавальнага склону;
4) дзеепрыслоўем;
5) інфінітывам.

***7. Дапасаванае азначэнне можа выражацца:***

1) прыметнікам;
2) інфінітывам;
3) прыслоўем;
4) дзеепрыметнікам;
5) назоўнікам.

***8. Недапасаванае азначэнне можа выражацца:***

1) прыналежным прыметнікам;
2) назоўнікам у форме творнага склону;
3) прыналежнымі займеннікамі ***яго, яе, іх;***
4)дзеясловам умоўнага ладу;
5) назоўнікам у форме роднага склону.

***9. Адзначце сказы з прамымі дапаўненнямі:***

1) Дрэва без каранёў не бывае . Ёсць свае карані і ў кожнага з нас (Б.Сачанка).
2) Там, у горадзе, мне не ставала прастору, неба (Б.Сачанка).
3) Кожная дзялянка, кожны лясны куток мае свой настрой, розны кожнага дня (І.Навуменка).
4) Вайна забрала ў Даніловічаў ажно чацвёра сыноў! (Я.Пархута).
5) Дзед раптам спахапіўся і змоўк, нібы баючыся, што нагаварыў лішняга (І.Шуцько).

***10. Адзначце сказы з недапасаванымі азначэннямі:***

1) Алесь нібы слухае, нібы здзіўляецца зноў, колькі цудоўных гукаў схавана ў душы яго друга-баяна (Я.Брыль).
2) Сонца зайграла на мокрых лісцях дуба (І.Шамякін).
3) І дзядзька, майстар быў на штукі, і быў механік на ўсе рукі (Якуб Колас).
4) Дні без дажджу праходзілі хутка (Я.Маўр).
5) Падуанскі універсітэт з гонарам ушаноўвае тых вялікіх, хто вучыўся альбо вучыў тут (А.Клышка).

***11. Адзначце сказы з дапасаванымі азначэннямі:***

1) Ночы пачаліся ціхія, вільготныя і цёмныя (І.Пташнікаў).
2) Рэчка здавалася невялікай: у лесе яна пачыналася, у лесе і канчалася (Якуб Колас).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3) Перапалоханая грукам і яркім святлом паветраных ліхтароў, яна забегала з пакоя ў пакой (А.Пальчэўскі).

4) Снег усюды белы, сыпкі, скрыпучы (Э.Самуйлёнак).

5) Пачаўся дзень, мусіць, бо шэраю стала вызначацца зямля (К.Чорны).

***12. Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы з'яўляюцца прыдаткамі:***

1) Партызанскі **доктар** Палейка падыходзіў да лячэння раненых па-свойму (Т.Хадкевіч).

2) Сабака, **па клічцы Амур**, упэўнена пайшоў па следу (М.Засім).

3) На доўгія вёрсты і мілі раскінуў **лес**- волат шатры (Якуб Колас).

4) **“Новая зямля”** з'явілася найбольш смелай і паслядоўнай паэтызацыяй самога быту чалавека працы (А.Адамовіч).

5) У старажытныя часы па **рацэ** Прыпяць сплаўлялі ў Кіеў будаўнічы лес, везлі смалу і дзёгаць (В.Вольскі).

***13. Адзначце сказы з акалічнасцямі мэты:***

1) Ты ідзеш абсохлай абочынай пакланіцца руням маладым (Н.Гілевіч).

2) Дзянішчык адышоўся, памахаў на развітанне рукой і знік у завулку (С.Александровіч).

3) У Ганкі ад страху і дзявочага сораму і мову адняло (М.Машара).

4) Са смагі поўны п'ю карэц халоднага бярозавага соку (В.Вітка).

5) Страхуючыся ад раптоўных нападаў, немцы пачалі высякаць лес (У.Карпаў).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ